ВЫЯЗНАЯ НАРАДА

# Гаспадарчым позіркам — на БАБЫНІЧЫ

**Чарговай выязной нарадай старшынь сельвыканкамаў Полацкага раёна на чале з намеснікам старшыні Полацкага райвыканкама Пятром Пяткевічам і старшынёй Полацкага раённага Савета дэпутатаў Іосіфам Грыбовічам пачаўся бягучы тыдзень у Бабыніцкім сельсавеце.**

Своеасаблівы экзамен па вырашэнні пытанняў жыццязабеспячэння насельніцтва перад працоўнымі групамі ўдзельнікаў нарады ў складзе кіраўнікоў службаў раённай улады, прадстаўнікоў шматлікіх прадпрыемстваў і арганізацый Полацкага раёна трымалі старшыня Бабыніцкага сельвыканкама Васіль Жалнерчык, а таксама населеныя пункты сельсавета, установы культуры, медыцыны, адукацыі.

Аб'езды і агляды аб'ектаў выявілі плюсы і мінусы ў добраўпарадкаванні населеных пунктаў, прадэманстравалі, як у Бабыніцкім сельсавеце рэалізуюцца мерапрыемствы па сацыяльнай абароне насельніцтва, удасканальваюцца формы і метады працы ўстаноў культуры, забяспечваецца бяспечная жыццядзейнасць насельніцтва. Некалькі працоўных груп паглядзелі на Бабынічы і навакольныя вёскі гаспадарчым позіркам, унеслі слушныя прапановы па далейшым паляпшэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва.



**Аляксандр Шаран,** майстар кацельні «Бабынічы. Д/сад» прадпрыемства кацельных і цеплавых сетак КУП «ЖКГ г.Полацка», ставіцца да сваіх працоўных абавязкаў з адказнасцю. Кацельня забяспечвае цяплом важны сацыяльны аб'ект — будынак, у якім размешчаны Бабыніцкі ФАП, бібліятэка-клуб і дзіцячы садок.

Наведванні Бабыніцкага дзіцячага садка, ФАПа і бібліятэкі паказалі, што ў будынку, у якім яны размешчаны, памяшканні выкарыстоўваюцца неэфектыўна. У вялікім пакоі, дзе зараз бібліятэка, можна паспяхова праводзіць клубныя масавыя мерапрыемствы для вяскоўцаў, а кніжным сцелажам — месца ў дастаткова вялікіх па плошчы дапаможных памяшканнях ФАПа і дзіцячага садка. Бабынічы — вялікая вёска, і ў населеным пункце павінна быць месца, дзе маглі б праходзіць пасяджэнні аб'яднанняў вяскоўцаў па інтарэсах. Для гэтых мэт выкарыстоўваецца зала ў будынку сельвыканкама, але людзі розных узростаў таксама маглі б збірацца і ў адзіным ў вёсцы асяродку культуры — у бібліятэцы.



**Наталля Пяткевіч** працуе загадчыцай Бабыніцкага ФАПа толькі чатыры месяцы. Малады спецыяліст аказвае медыцынскую дапамогу жыхарам 19 вёсак сельсавета, працягласць участка — 17 кіламетраў. Штодзень за медыцынскай дапамогай да фельчара звяртаюцца каля 14 чалавек.

Аб'езд вёсак Бабынічы, Вуглы, Маразёнкі, Бярэзінец выявіў недахопы ў добраўпарадкаванні, пустуючыя зямельныя ўчасткі, а таксама неабходнасць навядзення парадку на прыдарожнай паласе. Вялізныя дрэвы і кустоўе ўздоўж дарогі, якая вядзе з Бабыніч у Ухвішча, хутка будуць перашкаджаць руху транспарту. Вёску Бабынічы зусім не ўпрыгожвае будынак былой школы без вокнаў і дзвярэй, куды грамадзяне скідваюць смецце і розныя адыходы. У вёсцы Лесава ўвагу ўдзельнікаў нарады прыцягнулі некалькі пустуючых дамоў катэджнага тыпу, а таксама разбураныя будынкі былых мехтоку, майстэрняў і звераферму.

...Штодзень у населеных пунктах Бабыніцкага сельсавета ідзе няспешнае жыццё. Старшыня Бабыніцкага сельвыканкама Васіль Жалнерчык пытанні жыццязабеспячэння насельніцтва сельсавета, праблемы і клопаты вяскоўцаў трымае на кантролі. Добраўпарадкаванню населеных пунктаў сельская ўлада надае ўвагу круглы год. Сельвыканкам цесна супрацоўнічае з участковым інспектарам міліцыі, дзякуючы шматлікім агульным прафілактычным мерапрыемствам у Бабыніцкім сельсавеце неблагая крымінагенная сітуацыя. Штомесяц сумесна са спецыялістамі Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Полацкага раёна і ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Полацкага райвыканкама старшыня сельвыканкама ўдзельнічае ў рэйдах па наведванні жыхароў па месцы жыхарства. Як вынік — каля 80 пенсіянераў і інвалідаў ахоплены сацыяльным абслугоўваннем. Зараз, з надыходам зімы, асноўныя клопаты сельвыканкама — забеспячэнне насельніцтва дровамі, уборка снегу, вулічнае асвятленне населеных пунктаў. За год з дапамогай лясніцтва сельвыканкам забяспечвае дровамі каля 150 жыхароў, з уборкай снегу дапамагаюць ДРБУ-132, сельгаспрадпрыемства «Блізніца», КУП «ЖКГ г.Полацка».

**Аліна БАЛЬШАКОВА (тэкст і фота).**



## ПО СТРАНЕ

### ДОЛГОСРОЧНЫЕ КОНТРАКТЫ

Продукция ОАО «СветлогорскХимволокно» известна более чем в 40 странах. Впервые в 2018 году полиэфирные текстильные нити светлогорского производства вышли на рынки Армении, Азербайджана, Таджикистана и Португалии.

Нетканый материал спанбел начали реализовывать в Азербайджан. В Грецию отправлены первые партии гигиенической мембраны, начаты поставки углеродных материалов в Индию. Со всеми потребителями заключены долгосрочные контракты.

### В ИЗРАИЛЬ И КИТАЙ

Производственные мощности Минского хладокомбината №2 по созданию мороженого являются одними из крупнейших в Беларуси. Предприятие предлагает потребителю более 50 видов этой продукции.

Она представлена на рынках России (Санкт-Петербург, Москва, Смоленск, Подольск, Сочи, Ижевск, Нижний Новгород, Новосибирск, Барнаул, Сергиев Посад и др.) и Азербайджана. Недавно продукцией заинтересовался Израиль и Китай. С Израилем уже определились в ассортименте, из Китая получено 3 предложения о сотрудничестве.

### ДЛЯ «АМКОДОРА»

ОАО «Управляющая компания холдинга «Минский моторный завод» начало производство малолитражного четырехцилиндрового двигателя MMZ-3,6DTI. Двигатель, созданный по специальному заказу для нового погрузчика «Амкодор», может использоваться в тракторах, дорожно-строительной технике.

Возможна его автомобильная модификация с установкой на грузовики «ГАЗон Next». Новинка может эффективно конкурировать с производителями в странах СНГ. В частности, станет альтернативой двигателям производства Ярославского моторного завода.

**Подготовил Илья ШВЕДКО.**

## ДЕКРЕТ №3
## «О СОДЕЙСТВИИ ЗАНЯТОСТИ НАСЕЛЕНИЯ»: КАК УЗНАТЬ, ОТНЕСЕН ЛИ ГРАЖДАНИН К НЕ ЗАНЯТЫМ В ЭКОНОМИКЕ

В целях информирования граждан о нахождении их в базе данных трудоспособных граждан, не занятых в экономике, введена электронная услуга — предоставление сведений об отнесении гражданина к не занятому в экономике.

Услуга доступна **с 1 декабря 2018 г.**

Воспользоваться данной услугой гражданин может только в отношении себя лично.

**ЧТО НЕОБХОДИМО СДЕЛАТЬ?**

**Первый шаг.**

Получить электронную цифровую подпись или уникальный идентификатор: логин и пароль.

1. Для получения электронной цифровой подписи гражданин обращается в республиканский удостоверяющий центр ГосСУОК (подробная информация по ссылке https://nces.by/pki/) и проходит регистрацию на Едином портале электронных услуг согласно инструкции. Услуга платная.

Подробная информация о получении электронной цифровой подписи по ссылке https://nces.by/pki/ruc/order/initial-registration-private-person/

2. Для получения уникального идентификатора гражданину необходимо обратиться:

• в службу «Одно окно» и предъявить паспорт. На основании заявления формируется личный электронный кабинет гражданина и выдается уникальный идентификатор: логин и пароль;

• в Национальный центр электронных услуг по адресу: г.Минск, пр.Машерова, 25, пом. 200, отдел продаж и обслуживания клиентов. Режим работы: понедельник-пятница с 8.00 до 19.00. Телефон +375 17 229 30 00 доб. 707.

Уникальный идентификатор выдается бесплатно.

Подробная информация по получению уникального идентификатора по ссылке https://nces.by/nces-ptistupil-k-vydache-unikalnogo-identifikatora/

**Второй шаг.**

Необходимо авторизоваться на портале: осуществить вход в личный кабинет.

Авторизация осуществляется согласно способу регистрации: с использованием уникального идентификатора либо с использованием средств электронной цифровой подписи.

**Третий шаг.**

После входа в личный кабинет гражданину необходимо выбрать услугу 3.33.03 «Предоставление сведений об отнесении гражданина к не занятым в экономике» и получить ответ.

**ДОПОЛНИТЕЛЬНО ИНФОРМИРУЕМ**

Также для получения информации о том, содержатся ли сведения о гражданине в базе данных, можно обратиться в постоянно действующую комиссию по координации работы по содействию занятости населения Полоцкого районного исполнительного комитета посредством телефонного звонка 8(0214)46-21-71 или письменного обращения, в том числе и на адрес электронной почты комиссии **komissiya-zn@polotsk.vitebsk-region.gov.by.**

При этом для идентификации гражданина необходимо сообщить свой идентификационный номер, а также иную информацию, содержащуюся в документе, удостоверяющем личность.